*А. А. Валевіч, аспірант.*
*Навуковы кіраўнік – В. Е. Лявончыкаў,*
*доктар педагагічных навук, прафесар*

# УПЛЫЎ БІБЛІЯТЭЧНАЙ КАМУНІКАЦЫІ НА АСНОЎНЫХ СТАДЫЯХ САЦЫЯЛІЗАЦЫІ АСОБЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблема сацыялізацыі з'яўляецца міжгаліновай, міжведамаснай, ёю займаюцца розныя сацыяльныя інстытуты – установы культуры, адукацыі, у тым ліку і бібліятэка. Але кожны з іх ажыццяўляе сацыялізацыю асобы з дапамогай спецыфічных сродкаў, форм і метадаў. Праблема сацыялізацыі асобы таксама разглядаецца і ў бібліятэказнаўстве. Вядома, што Ю. П. Меленцьева абгрунтавала істотную ролю бібліятэкі, яе важнейшага працэсу – бібліятэчнага абслугоўвання ў сацыялізацыі асобы, а таксама зносін як неабходнага атрыбута [4, с. 100]. Зыходзячы з гэтага, С. А. Езава вылучае камунікатыўную сацыялізацыю, падкрэслівае, што камунікацыя мае сацыялізуючы характар [2, с. 101].

Пад бібліятэчнай камунікацыяй будзем разумець від сацыякультурнай камунікацыі, якая здзяйсняецца бібліятэкамі для распаўсюджвання ведаў і ўменняў, каштоўнасцей, а таксама інфармацыі аб дакументных патоках і масівах з мэтай уздзеяння на рознабаковае развіццё асобы, сацыяльных груп і грамадства цалкам, у тым ліку на сацыялізацыю. А пад сацыялізацыяй – працэс засваення і ўзнаўлення чалавекам культурных каштоўнасцей, сацыяльных норм, установак, узораў паводзін, самаразвіццё і самарэалізацыю ў грамадстве [5, с. 345].

Разглядаючы ўплыў бібліятэчнай камунікацыі на сацыялізацыю, адзначым, што працэс сацыялізацыі асобы характарызуецца вызначанай паслядоўнасцю праходжання. У айчыннай і замежнай

сацыялагічнай, сацыяльна-псіхалагічнай і педагагічнай літаратуры ў апошні час прадпрымаюцца спробы мадэлявання асноўных этапаў працэсу сацыялізацыі. Размежаванне стадый сацыялізацыі даецца вучонымі па-рознаму. У бібліятэказнаўстве таксама няма адзінага пункту гледжання на стадыі працэсу сацыялізацыі. Адны вучоныя (К. Ю. Геніева) вылучаюць тры стадыі сацыялізацыі, іншыя (Ю. П. Меленцьева) – пяць.

Трэба адзначыць, што ў навуковай літаратуры выдзяляюцца ўзроўні сацыялізаванасці асобы. Яны прадстаўлены наступным чынам: першы характарызуецца фарміраваннем у асобы стэрэатыпных паводзін; другі – развіццём выбіральнасці норм стандартных паводзін і стаўлення асобы да гэтых норм; трэці – развіццём здольнасці асобы да самаацэнкі, пошукам свайго месца ў жыцці, фарміраваннем асабістых поглядаў, усталёвак і г. д. [4, с. 7].

Улічваючы вылучаныя вучонымі стадыі, этапы і ўзроўні сацыялізацыі, разгледзім ролю публічных бібліятэк на кожнай з названых стадый.

Першая стадыя – гэта першасная сацыялізацыя, якой чалавек падвяргаецца ў дзяцінстве. Праваднікамі дзіця ў сацыяльны свет становяцца яго бацькі, выхавальнікі. Дзіця ідэнтыфікуе сябе з імі і пачынае дзейнічаць як яны, г. зн. прымае на сябе іх каштоўнасныя ўстаноўкі, дзякуючы чаму набывае асабістую ідэнтычнасць і прыналежнасць к каштоўнаснаму свету.

У працэсе першаснай сацыялізацыі бібліятэцы надаецца важная роля, так як яе карыстальнікам становіцца маленькі чытач. З ранняга дзяцінства дзіця наведвае бібліятэку разам з бацькамі, праглядае «добрыя» кніжкі, мае зносіны пасродкам гульні з іншымі дзецьмі. У сувязі з гэтым на базе публічных бібліятэк ствараюцца так званыя бібліятэкі сямейнага чытання, дзе пануе высокая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маральнасць, якая дазваляе выхоўваць духоўныя, маральныя і сацыяльныя каштоўнасці.

Спецыфікай работы бібліятэк з маленькім чытачом з’яўляецца шырокае выкарыстанне наглядных сродкаў і гульнёвых форм. Ва ўмовах першаснай сацыялізацыі бібліятэка можа выкарыстоўваць і такія формы работы вуснай камунікацыі, як падарожжа па бібліятэцы ці экскурсіі, мэта якіх пазнаёміць маленькага чытача з яе аддзеламі, рознымі кнігамі, правіламі карыстання імі. Пры далейшым наведванні бібліятэкі патрэбна абавязкова пазнаёміць маленькіх чытачоў з першаснай культурай чытання (праводзіць гутаркі аб элементах кнігі, арганізоўваць чытанні кніг «услых»).

Другая стадыя сацыялізацыі характарызуецца тым, што індывід пачынае успрымаць правілы, па якіх дзейнічаюць у грамадстве ўсе яго жыхары. Яна звязана з набыццём пэўных ведаў, якія адрозніваюцца ад жыццёвага вопыту, што індывід набыў у сям’і, школе, бібліятэцы і іншых сацыяльных інстытутах. Дадзены перыяд звязаны з эмацыянальнасцю, індывід пераходзіць да іншай сістэмы каштоўнасцей – грамадскай, пачынае ўсведамляць нацыянальную ідэнтычнасць. Задача бібліятэкі – накіроўваць чытанне, забяспечыўшы (з дапамогай кнігі) станоўчы эмацыянальны кантакт. Для гэтага патрэбна, каб чытач апынуўся ў тым бібліятэчным асяроддзі, дзе ён можа праяўляць сябе свабодна, напрыклад сярод сяброў-чытачоў пэўнай бібліятэкі. Дзеля гэтага ў бібліятэцы ствараюцца гурткі, клубы па інтарэсах, дзе чытач можа задаволіць сацыяэмацыянальныя запатрабаванні з дапамогай інфармацыйных рэсурсаў і такім чынам хутчэй сацыялізавацца ў грамадстве.

Вядома, што для ўсведамлення нацыянальнай ідэнтычнасці важную ролю адыгрывае мастацкая літаратура, у тым ліку літаратура беларускіх аўтараў. Бібліятэкі, фарміруючы культуру

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чытання, прапаноўваюць чытачам узоры для пераймання жыццёвых каштоўнасных арыенціраў грамадства, забяспечваючы нацыянальную ідэнтыфікацыю і сацыялізацыю ў межах нацыянальнай культуры.

У практыцы бібліятэка, вядома, выкарыстоўвае не толькі вусную бібліятэчную камунікацыю, але галоўным чынам дакументную, звязаную з выкарыстаннем кніг ці інфармацыйных рэсурсаў. У дакументнай камунікацыі, у адрозненні ад вуснай, карыстальнік рэалізуе дыялагічную камунікацыю з аўтарамі кніг. У выпадку з «тэкставым» дыялогам, калі тэкст кнігі выконвае пасіўную прэзентацыйную функцыю суб’ектыўнасці аўтара, неабходна гутарка з рэальным («жывым») суб’ектам камунікацыі, у якасці якога можа выступаць бібліятэкар ці вопытны чытач-сябра [3, с. 49].

Трэцяя стадыя сацыялізацыі – самая цяжкая. Індывід павінен «запусціць» у сваю самасвядомасць і звязаць, не парушаючы асноў першаснай і другаснай сацыялізацыі, не толькі сямейны і спецыялізаваны вопыт, нацыянальную ідэнтычнасць, а таксама і сутнасна іншыя каштоўнасныя ўстаноўкі «знешняга» соцыуму, які выкарыстоўвае іншую мову, звычаі, рытуалы [1, с. 17]. Паспяховая рэалізацыя гэтай задачы магчыма толькі тады, калі індывід выпрацоўвае «полікультурны» тып мыслення, які характарызуецца гатоўнасцю прыняць як дадзенае прынцыповае адрозненне культур. А гэта выхад на новыя якасці індывіда як «полікультурнай асобы» і сведчыць аб тым, што трэцяя стадыя сацыялізацыі ў большай ступені звязана з міжкультурнай камунікацыяй, якая займае пэўнае месца ў дзейнасці бібліятэк. Па азначэнні К. Ю. Геніевай, міжкультурная камунікацыя – гэта «особая форма коммуникации двух или более представителей различных культур, в ходе которой происходит обмен информацией и культурными ценностями

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

взаимодействующих культур» [1, с. 60]. Неабходна ўдакладніць, што ва ўмовах бібліятэкі ўзаемадзейнічаюць розныя культуры ў межах нацыянальнай (дзяржаўнай) агульнасці (так званыя этнічныя меншасці) і замежныя культуры. Таму на першы план выходзяць такія параметры ўзаемадзеяння, як веданне замежных моў і веданне культуры носьбітаў гэтых моў. Для гэтага ў публічных бібліятэках існуюць аддзелы і фонды замежнай літаратуры. У такіх аддзелах сабрана інфармацыя для забеспячэння асноўных працэсаў дзейнасці: 1) літаратура для вывучэння замежнай мовы, прадстаўленая рознымі вучэбнікамі, практычнымі дапаможнікамі, размоўнікамі, слоўнікамі і інш.; 2) літаратура, якая знаёміць карыстальніка з культурай і традыцыямі пэўных народаў.

Такім чынам, у працэсе сацыялізацыі індывіда ў першую чаргу ўдзельнічаюць такія сацыяльныя інстытуты, як сям'я, школа. Апошнія далучаюць яго да каштоўнасцей, ведаў, уменняў, якія сфарміраваны ў сям'і і школе. Бібліятэка таксама ўключана ў працэс сацыялізацыі асобы, пэўных груп і грамадства, больш таго, яна прымае ўдзел ва ўсіх стадыях сацыялізацыі, выкарыстоўваючы пры гэтым спецыфічныя сродкі, што характэрны толькі ёй (інфармацыйныя рэсурсы, формы і метады працы з імі).

---

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Гениева, Е. Ю.* Библиотека как центр межкультурной коммуникации / Е. Ю. Гениева. – М. : Росспэн, 2005. – 206, [1] с.

2. *Езова, С. А.* Библиотекарь и читатель : типы поведения / С. А. Езова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2009. – 109 с.

3. *Лазаревич, А. А.* Глобальное коммуникационное общество / А. А. Лазаревич. – Минск : Беларусая думка, 2008. – 350 с.

4. *Мелентьева, Ю. П.* Библиотека и юношество : поиски взаимопонимания : библиотечное обслуживание как процесс со-

циализации личности / Ю. П. Мелентьева. – М. : Ин-т психологии РАН, 1999. – 160 с.
5. *Основы* педагогики : учеб. пособие / А. И. Жук [ и др.] ; под. ред. А. И. Жука. – Минск : Аверсэв, 2003. – 349 с.
РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ